# Подых зямлі

## Як мяняецца наша стаўленне да вёскі

Былі нагода і магчымасць яшчэ раз завітаць у гасцінны і мілы Добруш, дзе на самым пачатку верасня святкавалі Дзень беларускага пісьменства, – гэтым разам на абласныя «Дажынкі». Але праз пэўныя абставіны застаўся дома і сачыў за падзеямі вачыма калег-журналістаў БЕЛТА. Тыя, як мне падалося, працавалі настолькі аператыўна і віртуёзна, што змаглі перадаць не толькі храналогію свята, але і непаўторную атмасферу, што панавала ў райцэнтры паблізу Гомеля.

Люблю нашы «Дажынкі». Яшчэ з тых часоў, калі яны паводле ініцыятывы Прэзідэнта займелі высокі дзяржаўны статус, а па сутнасці на такую вышыню кіраўнік дзяржавы падняў земляроба, чалавека працы, ад якога найперш залежыць харчовая бяспека краіны. «Дажынкі» – яркая, запамінальная падзея і цяпер, калі яны ладзяцца на абласным узроўні. І ўсё ж гэта толькі вяршыня айсберга, бачная часцінка той велізарнай працы, якая актыўна ў свой час распачалася ў дзяржаве паводле даручэння Прэзідэнта. Успомнім, спачатку было адраджэнне вёскі, новыя дзяржпраграмы прадугледжвалі ўжо яе ўстойлівае развіццё.

Безумоўна, дзякуючы такому грунтоўнаму падыходу наша сельская гаспадарка набыла зайздросную дынаміку развіцця. Асабліва гэта адчувальна цяпер: у сённяшніх надта няпростых умовах удаецца не толькі цалкам забяспечваць насельніцтва якаснымі прадуктамі харчавання, а і нарошчваць экспарт, нівеліруючы негатыўны ўплыў заходніх санкцый супраць Беларусі.

Шмат дзе ў сельскай мясцовасці ў бытавым аспекце жыццё амаль не адрозніваецца ад гарадскога, хіба што сваімі неаспрэчнымі, вясковымі выгодамі накшталт чыстага паветра і адсутнасці людскога тлуму. Усё часцей вёску выбіраюць на жыхарства, маладыя людзі ў тым ліку. Яна становіцца прывабнай, сучаснай, перспектыўнай.

**На абласных «Дажынках» у Добрушы Гомельскай вобласці. 12 лістапада 2022 года**








І ўсё ж прынцыпова важнае, самае галоўнае палягае ў тым, што мяняецца людская псіхалогія, наша стаўленне да вёскі, да зямлі. Магчыма, не так хутка, як хацелася б, ідуць гэтыя глыбінныя працэсы, але яны няўмольна набліжаюць да асэнсаванага ўсведамлення простай жыццёвай праўды: для сваёй зямлі трэба быць не часова павераным, які бессаромна выціскае з яе ўсе сокі, а гаспадаром. А хто такі гаспадар найперш? Той, хто клапоціцца і дбае пра заўтрашні дзень.

Мне пашчасціла шмат разоў бываць на «Дажынках» – і на рэспубліканскіх, і ў раёне, і на тых, што ладзяць у гаспадарках. Гэта заўсёды ўрачыста і святочна, захапляльна. Але як для мяне, то самае цікавае – паслухаць людзей, іх думкі і разважанні пра сваю працу і парадкі на зямлі, перспектывы. Цікаўнасць і дапытлівасць – надзейныя памочнікі, калі хочаш даведацца нешта новае і, як кажуць, з першых вуснаў. А мець справу з людзьмі дасведчанымі і нераўнадушнымі, хай сабе са звычайнымі працаўнікамі ці вопытнымі і паважанымі аграрыямі, – гэта яшчэ тая школа жыцця!

Што адметна, апошнім часам найчасцей гавораць не пра паказчыкі, не хваляцца адно перад адным голымі лічбамі ці колькасцю перадавікоў, як раней. Хоць ёсць і такое, і гэта нармальна, бо здаровы дух канкурэнцыі і спаборніцтва любой справе спрыяе, а ў сельскагаспадарчай вытворчасці тым больш. Шкала каштоўнасцей сучаснага вяскоўца, які працуе на зямлі, ужо іншая, не ранейшая прамалінейная. Яму ўжо не карціць любой цаной дабіцца рэкорднай ураджайнасці сёлета, а надалей як бог дасць. Не, ён думае, што будзе заўтра і што трэба зрабіць на зямлі сёння, каб заўтрашні дзень не расчараваў. Каб яна была дагледжанай і прыгожай: эстэтыка вытворчасці, лічы, ёсць паказчык умелага выкарыстання сучасных сельскагаспадарчых тэхналогій. Надышоў час гаспадароў – людзей, незалежна ад пасады зацікаўленых, нераўнадушных, прадпрымальных, прафесіянальных. Якія паважаюць сваю працу і тую акалічнасць, што шчыруюць менавіта на зямлі і дзеля яе.

Сённяшнія рэаліі ўшчэнт разбіваюць, здавалася б, неаспрэчны тэзіс, што толькі ўласнік можа быць эфектыўным і дбайным гаспадаром. Варта згадаць дастаткова жыццёвых гісторый, калі навaспечаныя «фермеры» пасля свайго гаспадарання пакідалі толькі зарослыя бур'яном палі і вытаптаныя выганы. Выходзіць, права на валоданне кавалкам зямлі не гарантуе ашчадлівага і разумнага да яе стаўлення. Відаць, трэба дарасці да гэтага – не толькі розумам, а і душою, усвядоміўшы сваю адказнасць і ролю. Гэта не эканамічныя катэгорыі, але без іх цяжка і нават немагчыма ўжо ўявіць сучасную вёску.

Быць гаспадаром, зразумела, няпроста – зямля пастаянна патрабуе клопату.

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нядаўняй рэспубліканскай нарадзе-семінары па пытаннях аднаўлення і выкарыстання меліяраваных зямель вызначыў тры асноўныя напрамкі, па якіх павінна ісці напружаная праца. Найперш гэта меліярацыя, з якой «далей цягнуць нельга» – на пачатак пяцігодкі ў краіне налічвалася 412 тыс. гектараў зямлі, што былі раней меліяраваныя і зараз патрабуюць аднаўлення. Паводле ацэнкі кіраўніка дзяржавы тэмпы гэтых работ пакуль нізкія. Важным элементам культуры земляробства Прэзідэнт лічыць вяртанне ў сельгасзварот закінутых прысядзібных участкаў і зямель, што займаюць старыя фермы і збожжаткі. Гэта дасць адчувальны штуршок для развіцця сельгасвытворчасці і, уласна, усяго вясковага жыцця. «Вёска становіцца іншай. Не будзе гэтых вёсак старых, якіх у нас сотні тысяч было. Будуць аграгарадкі. Людзі хочуць жыць з выгодамі, у добрых дамах. У кожнай вёсачцы і на хутары мы гэта не пабудуем. Таму мы прыйшлі да таго, каб будаваць аграгарадкі», – падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Задачы, якія ставіць Прэзідэнт, дзяржаўнага маштабу. Але грунтуюцца яны на ўсё той жа нашай адказнасці за зямлю, на якой жывём і якая нас корміць. Усвядоміць гэта галавой і сэрцам, да астанку – вялікая справа.

Гэта як подых зямлі адчуць.

***Ігар ГАНЧАРУК***